Крыніца.info

06.10.2018

# “Беларусь і Біблія”: дзеці цікавяцца Бібліямі з усяго свету

Э. Дзвінская, фота аўтара




На выставе «Беларусь і Біблія» праходзяць заняткі Клуба кніжных прафесараў. Місіс Дэніс Кэрал дэманструе дзецям старажытныя скруткі пергаменту, распавядае пра іх гісторыю і дэманструе гусіныя пер’і, якімі пісалі перапісчыкі.

Місіс Дэніс добра ведае, як кантактаваць з дзецьмі, бо ў іх з доктарам Скотам Кэралам – чацвёра дзяцей: два сыны Бенджамен і Кэмрын, дзве дачкі Джой і Эн і чацвёра ўнукаў. Іх сям’я прыналежыць да неасацыяванай пратэстанцкай царквы Bridge Bible Church. “У нашым горадзе шмат моцных хрысціянскіх сем’яў”, — кажа місіс Дэніс.

Дэніс і Скот Кэралы жывуць у маляўнічым штаце Мічыган у горадзе Гранд Хэйвен, паблізу ад вялікага возеры Мічыган. Ландшафт іх мясцовасці разнастайны халмамі, пясчанымі дзюнамі. Сужанцы разам ужо сорак гадоў. Місіс Дэніс суправаджае свайго мужа ў падарожжах па свеце. Доктар Кэрал праводзіць семінары і чытае лекцыі ва ўніверсітэце ў Нігерыі і місіс Дэніс адпраўляецца ў далёкую афрыканскую краіну разам з ім.




Кожны дзень выстаўку наведваюць вучні нядзельных і агульнаадукацыйных школ з настаўнікамі. Выкладчык прыватнай пачатковай школы Зміцер Хведарук разам з маладымі настаўніцамі запрасіў на выставу вучняў 1- 4 класаў. Дзеці з цікавасцю слухаюць аповеды экскурсаводаў, з задавальненнем майструюць з паперы каўчэг, расфарбоўваюць тэматычныя формы, складаюць пазлы з біблейскімі сюжэтамі, фатаграфуюцца ў зоне для гульняў. Валанцёры займаюць маленькіх дзетак забаўкамі ды гульнямі.